***Хмялеўская Н. У.**, настаўніца пачатковых класаў,*
***Церах А. М.**, настаўніца пачатковых класаў.*
*Махнавіцкая сярэдняя школа Мазырскага раёна Гомельскай вобласці*

# 100 крокаў да поспеху

## Заданні для падрыхтоўкі да алімпіяды па беларускай мове і літаратурным чытанні

*Заканчэнне. Пачатак гл. № 2, 3 за 2022 г.*

**75.** Якая прыказка зашыфравана? Лічбы абазначаюць месца літары ў беларускім алфавіце.

1)

| | | |
|---|---|---|
| 24 20 16 | 17 18 1 25 21 6, | 20 16 11 |

| | |
|---|---|
| 15 6 | 19 21 14 21 6. |

2)

| | | | |
|---|---|---|---|
| 21 | 19 3 1 10 14 | 12 18 1 10, | 32 12 |

| | |
|---|---|
| 21 | 18 1 10. |

3)

| | | |
|---|---|---|
| 32 12 10 32 | 19 1 14 10, | 20 1 12 10 32 |

| | |
|---|---|
| 15 1 27 28 | 19 1 15 10. |

4)

| | | | |
|---|---|---|---|
| 6 19 25 29 | 9 1 | 3 1 13 1, | 1 |

| | | |
|---|---|---|
| 18 16 2 10 25 29 | 9 1 | 12 1 14 1 18 1. |

**76.** Адкажыце на пытанне словамі з прыказкі.
1) Куды глядзіць воўк, колькі яго не кармі?
2) Куды давядзе язык?
3) Пад які камень вада не бяжыць?
4) Чым носа не дастаць?
5) У якім краі, як у раі?
6) За што не купіш сябра?
7) Колькі разоў трэба адмераць, каб адзін раз адрэзаць?
8) Каму адзін пень за тры ваўкі здаецца?
9) Каго ногі кормяць?

**77.** Замяніце выразы ўстойлівымі словазлучэннямі.

Перастаць слухацца кагосьці — ... .
Уводзіць у зман, абяцаць што-небудзь і не выконваць — ... .
Невядома яшчэ, ці ажыццявіцца штосьці — ... .
Вельмі перабольшваць, драбніцу пераказаць, як значнае, вялікае — ... .
Быць разявакам, няўважлівым — ... .
У кагосьці зусім няма музычнага слыху — ... .
Першы памочнік — ... .
Сем пятніц на тыдні — ... .
Сёмая вада на кісялі — ... .

**78.** Устаўце словы, якія прапушчаны, ва ўстойлівыя спалучэнні.

Як ... на новыя вароты.
... па калена.
Як з ... вада.
Як ... наплакаў.
Дзе і Макар ... не пасе.
Як ... языком злізала.
Надзьмуцца як ... на крупы.
Біцца як ... аб лёд.

**79.** Падбярыце да слоў адпаведныя фразеалагізмы з правага слупка.

| | |
|---|---|
| дружна | ва ўвесь дух |
| цесна | душа ў душу |
| хутка | яблыку няма дзе ўпасці |
| рэдка | гады ў рады |
| блізка | па кропельцы цыркаць |
| марудна | спакон вякоў |
| далёка | рукой падаць |
| нечакана | як Піліп з канапель |
| здаўна | у свіныя галасы |
| позна | куды Макар цялят не ганяў |

**80.** Падбярыце аднаслоўныя сінонімы да наступных фразеалагізмаў.

Рукой падаць — ... , хоць іголкі збірай — ... , душа ў душу — ... , лісам падшытыя — ... , хоць касой касі — ... , як гром з яснага неба — ... , кату па пяту — ... , хварэць на пана — ... .

**81.** Замяніце фразеалагізмы дзеясловам.

Зарубіць на носе — ... , прыкусіць язык — ... , біць лынды — ... , блытацца пад нагамі — ... , мазоліць вочы — ... , кляваць носам — ... , задзіраць нос — ... .

**82.** Узнавіце фразеалагізмы, дапісаўшы іх.

Біцца як рыба аб ...; блытацца пад ...; выйсці сухім з ...; надзьмуцца як мыш на ...; праваліцца скрозь ... .

**83.** Адзначце, які фразеалагізм мае значэнне *хітруючы, адцягваць увагу ад чагосьці важнага.*

Вастрыць зубы.
Зуб на зуб не пападае.

Загаворваць зубы.
Ні ў зуб нагой.
Праз зубы.
На ўсе трыццаць два зубы.

**84.** Якое сцвярджэнне правільнае? Абвядзіце лічбу з правільным адказам.

1) Казка — невялікі мастацкі твор, напісаны рытмізаванай мовай.

2) Загадка — гэта твор вуснай народнай творчасці з шырокім выкарыстаннем выдумкі.

3) Байка — невялікі іншасказальны твор павучальнага характару, звычайна ў вершаванай форме.

4) Верш — кароткае апісанне якога-небудзь прадмета, з'явы, якія трэба пазнаць, адгадаць.

**85.** Якога слова не хапае на месцы пропуску ў назвах беларускіх народных казках?

1) «Каза-...».
2) «Муха-...».
3) «Піліпка-...».
4) «Музыка-...».
5) «Лісіца-...».

**86.** Якая народная казка пачынаецца словамі?

| | |
|---|---|
| А. Касіў на лузе касец. Змарыўся і сеў пад куст адпачыць. Дастаў торбачку, развязаў і пачаў есці. | 1. «Ад крадзенага не пасыцееш» |
| Б. Жыў адзін цікавы хлопец Андрэй. Хацеў ён усё ведаць. Куды ні гляне, што ні ўбачыць — аб усім у людзей распытваецца, да ўсяго дапытваецца. | 2. «Лёгкі хлеб» |
| В. Былі ў аднаго чалавека два сыны. Як выраслі яны, бацька сказаў: «Пара, сыны, за сталую работу брацца. Хто з вас чым хоча заняцца?» | 3. «Андрэй за ўсіх мудрэй» |
| Г. Даўней было так: як састарэе бацька, то сын завязе яго ў глухую пушчу ды і пакіне там... | 4. «Стары бацька» |

А — ___ , Б — ___ , В — ___ , Г — ___ .

**87.** Якая прыказка падыходзіць да зместу казкі?

| | |
|---|---|
| А. Сябры пазнаюцца ў бядзе. | 1. «Каза-манюка» |
| Б. Смеламу перамога ідзе насустрач. | 2. «Лёгкі хлеб» |
| В. Хто маніць, таму не вераць. | 3. «Хітры Вол» |
| Г. Без працы няма чаго хлеба шукаці. | 4. «Як курачка пеўніка ратавала» |
| Д. Крукам носа не дастаць. | 5. «Ганарыстая варона» |
| Е. На свеце, брат, жывучы, усяго нажывеш — і Кузьму бацькам назавеш. | 6. «Недалікатны сын» |

А — ___ , Б — ___ , В — ___ , Г — ___ , Д — ___ , Е — ___ .

**88.** Выправіце памылкі і правільна запішыце назву беларускай народнай казкі.

1) «Малады бацька».
2) «Як курачка індыка ратавала».
3) «Аляксей за ўсіх мудрэй».
4) «Коцік Петрык і шышка».
5) «Жытнёвы каласок».
6) «Коцік, пеўнік і сястрыца».

**89.** Вызначыце, хто з герояў беларускіх народных казак і ў якой казцы зрабіў гэта.

1) Парушыў звычай не карміць старых бацькоў.

2) Папрасіў у лісы дазволіць яму перад смерцю патанцаваць.

3) Вырашыў пакараць казу.

4) Дапамог зайчыку выгнаць казу.

5) Запрог камароў у каляску ды паехаў на пагулянку.

6) Усё на дзверы паглядваў: ці не ідзе хто вала шукаць.

7) Куды ні гляне, што ні ўбачыць — аб усім у людзей распытваецца.

**90.** Злучыце прадмет з назвай народнай казкі, у якой ён сустракаецца.

| | |
|---|---|
| лапата і печ | «Муха-пяюха» |
| дудачка | «Як курачка пеўніка ратавала» |
| бобінка | «Музыка-чарадзей» |
| скрыпачка | «Коцік, пеўнік і лісіца» |
| каласок | «Зайкава хатка» |
| каляска | «Піліпка-сынок» |
| мяшок | «Сынок з кулачок» |
| лапаць | «Пшанічны каласок» |
| каса | «Прагны багацей» |
| пярсцёнак | «Як лісіца ваўка судзіла» |

**91.** Вызначыце жанр твораў.

1) «Стары бацька».
2) Ніл Гілевіч «Я — беларус».
3) «Музыка-чарадзей».
4) «Баю-баінку-баю».
5) «Вясна красна, адкуль прыйшла».
6) Алесь Махнач «Юныя абаронцы».
7) Барыс Сачанка «Хлеб».

**92.** У паэтычных радках згубіліся словы. Дапамажыце аднавіць аўтарскі тэкст.

1) Якуб Колас «Усход сонца».
На ўсходзе ______ грае
Пераліўным ______,
Сыпле ______ над гаем
І над ______.

2) Ніл Гілевіч «Я — беларус».
Я — ______ , я нарадзіўся
На гэтай казачнай ______ ,
Дзе між ______ і пушчаў дзікіх
Адвеку ______ жылі.

3) Уладзімір Карызна «Люблю цябе, Белая Русь».
Жытнёвае ______ , лясы і ______ ,
Крынічанька ў лузе і ў небе ______ —
Услухайся толькі, усё тут гаворыць:
Люблю цябе, Белая, Белая ______ .

4) Васіль Жуковіч «Першая настаўніца».
Мне першая ______
______ навек.

Найпершая настаўніца —
мой родны ______ .

5) Пятрусь Броўка «А ты хоць дрэва пасадзіў?».
Дзе дваццаць ______ таму назад
Ляжаў ______ акамянелы —
Расцвіў прыгожы, буйны ______ ,
Паплыў удаль, як ______ белы...

6) Пятрусь Броўка «А хіба ёсць, што забываюць?».
Ляжыць ______ ля пераправы,
Каля маленькае ______ .
Ляжыць ______
Вялікай ______ ,
______ здабытай на вякі.

**93.** Устанавіце адпаведнасць паміж назвай верша і ўрыўкам з яго.

| Назва верша | Урывак |
|---|---|
| А. Канстанцыя Буйло «Люблю» | 1. На ўсходзе неба грае<br>Пераліўным блескам,<br>Сыпле золата над гаем<br>І над пералескам. |
| Б. Якуб Колас «Усход сонца» | 2. Слаўлю я свой край любімы,<br>Незгасальную зару.<br>Як ты сэрцу майму міла,<br>Дарагая Беларусь! |
| В. Пятрусь Броўка «Дарагая Беларусь» | 3. Жытнёвае поле, лясы і азёры,<br>Крынічанька ў лузе і ў небе жаўрук —<br>Услухайся толькі, усё тут гаворыць:<br>Люблю цябе, Белая, Белая Русь. |
| Г. Уладзімір Карызна «Люблю цябе, Белая Русь» | 4. Люблю наш край — старонку гэту,<br>Дзе я радзілася, расла,<br>Дзе першы раз спазнала шчасце,<br>Слязу нядолі праліла. |

А__ , Б __ , В __ , Г __ .

**94.** Запішыце імёны да прапанаваных прозвішчаў беларускіх пісьменнікаў.

... Багдановіч; ... Ігнаценка; ... Купала; ... Колас; ... Гілевіч; ... Броўка; ... Буйло; ... Жуковіч; ... Сачанка; ... Чарняўскі; ... Вольскі.

**95.** Які з твораў з'яўляецца казкай, які — вершам, які — байкай?

1) «Фанабэрысты Мухамор».
2) «Стары бацька».
3) «Першая настаўніца».

**96.** Разгадайце крыжаванку і перакладзіце выдзеленае слова на рускую мову.




1. Вусная народная творчасць.
2. Словы, сказы, музычныя фразы, якія паўтараюцца ў літаратурным творы.
3. Казкі ў большасці пачынаюцца словамі «жылі-былі». Як называецца такі пачатак?
4. Заканчваецца казка словамі «Тут і казцы канец». Як называецца такі канец?
5. Складальнік або расказчык казак.

**97.** Да якога жанру фальклору адносяцца гэтыя радкі?

| | |
|---|---|
| А. Да люлі-люлі, каточак,<br>Да злізаў бабчын мядочак.<br>Сама бабачка злізала,<br>На катка сказала. | 1. Лічылка |
| Б. Раз, два, тры, чатыры,<br>Ліска курачак лічыла.<br>Пяць, шэсць, сем, восем,<br>Толькі пер'е засталося.<br>*(М. Пазнякоў)* | 2. Заклічка |
| В. Ладкі ладком, піражкі з мядком,<br>Кашка з алеем, есці не ўмеем. | 3. Забаўлянка |
| Г. Божая кароўка, паляці на небка,<br>Прынясі нам хлебка —<br>Чорнага і белага,<br>Толькі не гарэлага. | 4. Калыханка |

А ____ , Б____ , В ____ , Г ____ .

**98.** Адгадайце загадкі. Словы-адгадкі пачынаюцца на літару ***в***.



1. Чырвонае карамысла праз рэчку павісла.
2. У адным доме сотні жыхароў, а сям'я адна.
3. Без ног бяжыць, без вачэй глядзіць.
4. Ляціць, а не птушка, вые, а не звер.
5. Што без вады плавае?

**99.** Расшыфруйце рэбусы.

1) Запішыце назвы птушак.















2) Запішыце назвы жывёл.




**100.** У беларускім алфавіце гэта літара займае 22-е месца; больш як за паўтара стагоддзя яна перадае на пісьме характэрны беларускі гук — зычны, цвёрды, які стаіць пасля галосных перад зычнымі; гэтай літары няма ў іншых алфавітах славянскіх моў. Адкажыце на пытанні:

1) Пра якую літару ідзе гаворка?

2) У якім старажытным горадзе Беларусі ўстанавілі помнік у гонар гэтай унікальнай літары?

3) Падбярыце па тры словы, каб гэта літара знаходзілася ў пачатку, у сярэдзіне і ў канцы слова.

## *Адказы*

**75.** 1) Хто працуе, той не сумуе.
2) У сваім краі, як у раі.
3) Якія самі, такія нашы сані.
4) Есць за вала, а робіць за камара.

**76.** 1) У лес. 2) Да Кіева. 3) Пад ляжачы. 4) Крукам. 5) У сваім. 6) За грошы. 7) Сем. 8) Баязліўцу. 9) Ваўка.

**77.** 1) Адбіцца ад рук. 2) Вадзіць за нос. 3) Віламі па вадзе пісана. 4) Зрабіць з мухі слана. 5) Варон лічыць. 6) Мядзведзь на вуха наступіў. 7) Правая рука. 8) Чалавек, які часта мяняе свае рашэнні. 9) Далёкая радня.

**78.** 1) Баран. 2) Мора. 3) Як з гусі. 4) Кот. 5) Коз. 6) Карова. 7) Мыш. 8) Рыба.

**79.** Дружна — душа ў душу; цесна — яблыку няма дзе ўпасці; хутка — ва ўвесь дух; рэдка — гады ў рады; блізка — рукой падаць; марудна — па кропельцы цыркаць; далёка — куды Макар цялят не ганяў; нечакана — як Пiлiп з канапель; здаўна — спакон вякоў; позна — у свіныя галасы.

**80.** Блізка, светла, дружна, хітрыя, многа, нечакана, маленькі, ленавацца.

**81.** Запомніць, замаўчаць, гультайнічаць, перашкаджаць, дакучаць, драмаць, задавацца.

**82.** Біцца як рыба аб лёд; блытацца пад нагамі; выйсці сухім з вады; надзьмуцца як мыш на крупы; праваліцца скрозь зямлю.

**83.** Загаворваць зубы.

**84.** 3.

**85.** 1) «Каза-манюка». 2) «Муха-пяюха». 3) «Пiлiпка-сынок». 4) «Музыка-чарадзей». 5) «Лісіца-хітрыца».

**86.** А — 2 , Б — 3, В — 1, Г — 4.

**87.** А — 4, Б — 3, В — 1, Г — 2, Д — 5, Е — 6.

**88.** 1) «Стары бацька». 2) «Як курачка пеўніка ратавала». 3) «Андрэй за ўсіх мудрэй». 4) «Коцік Петрык і мышка». 5) «Пшанічны каласок». 6) «Коцік, пеўнік і лісіца».

**89.** 1) Сын, казка «Стары бацька». 2) Гусак, казка «Лісіца і гусак». 3) Дзед, казка «Каза-манюка». 4) Певень, казка «Зайкава хатка». 5) Муха-пяюха, казка «Муха-пяюха». 6) Сын, казка «Ад крадзенага не пасыцееш». 7) Андрэй, казка «Андрэй за ўсіх мудрэй».

**90.** Лапата і печ — «Пiлiпка-сынок»; дудачка — «Музыка-чарадзей»; бобінка — «Як курачка пеўніка ратавала»; скрыпачка — «Як лісіца ваўка судзіла»; каласок — «Пшанічны каласок»; каляска — «Муха-пяюха»; мяшок — «Коцік, пеўнік і лісіца»; лапаць — «Сынок з кулачок»; каса — «Зайкава хатка»; пярсцёнак — «Прагны багацей».

**91.** 1) Казка. 2) Верш. 3) Казка. 4) Калыханка. 5) Песня. 6) Апавяданне. 7) Апавяданне.

**92.** 1) Неба, блескам, золата, пералескам.
2) Беларус, зямлі, лясоў, прашчуры.
3) Поле, азёры, жаўрук, Русь.
4) Настаўніца, запомніцца, чалавек.
5) Год, дзірван, сад, ветразь.
6) Салдат, ракі, салдат, славы, крывёй.

**93.** А — 4, Б — 1, В — 2, Г — 3.

**94.** Максім Багдановіч; Рыгор Ігнаценка; Янка Купала; Якуб Колас; Ніл Гілевіч; Пятрусь Броўка; Канстанцыя Буйло; Васіль Жуковіч; Барыс Сачанка; Мікола Чарняўскі; Артур Вольскі.

**95.** 1) Байка. 2) Казка. 3) Верш.

**96.** Фальклор. Паўтор. Зачын. Канцоўка. Казачнік. Казка — сказка.

**97.** А — 4, Б — 1, В — 3, Г — 2.

**98.** Вясёлка. Вулей. Вада. Вецер. Воблакі.

**99.** 1) Голуб, сава, сокал, ластаўка, шпак. 2) Баран, мядзведзь, вожык, кот, ішак.

**100.** 1) Літара ў (у нескладовае). 2) У Полацку. 3) На ўроку, пясчаны ўзгорак, галаўны ўбор; праўда, воўк, паўза; любоў, ішоў, бацькаў.